Падтрымай "Вясну" на PATREON

Міліцыя ў Маладзечна двойчы складала пратаколы на актывістаў прадпрымальніцкага руху

16.05.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, акцыі



Актывісты прадпрымальніцкага руху з пратаколамі ў Маладэчна.

Супрацоўнікі міліцыі Маладзечанскага РАЎСа ўсталявалі 14 траўня ў пэўным сэнсе антырэкорд, склаўшы двойчы за адзін дзень пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні на адных і тых жа актывістаў незарэгістраванага Камітэта выратавання прадпрымальніцтва (КВП). Участковыя інспектары і капітаны міліцыі Раман Ахметаў і Максім Паўчанка ўбачылі парушэнне часткі 3 артыкула 23.34 КоАП РБ у паводзінах старшыні Барысаўскай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) **Алеся Абрамовіча.** Апошні спачатку з мегафонам у руках ўдзельнічаў у несанкцыянаваным

пікеце на рынку Маладзечанскага райпо, які перарос ў пратэстны мітынг прадпрымальнікаў супраць антыпрадпрымальніцкіх, на думку дзеячаў КВП, прэзідэнцкіх указаў №222 і №48. Затым тое ж самае ён рабіў каля крамы «Суседзі» па праспекце Вялікі Гасцінец, Пратакол на рынку Маладзечанскага райпо афармiў на Абрамовіча Ахметаў, а каля крамы «Суседзі» – Паўчанка.

Як паведаміў праваабаронцам Алесь Абрамовіч, аналагічна супрацоўнікі Маладзечанскага РАЎС паводзілі сябе як у дачыненні да лідэра пратэстнага прадпрымальніцкага руху ў Беларусі **Алеся Макаева,** так і арганізатара мітынгу на рынку райпо горада Маладзечна і кіраўніка абласной арганізацыі незарэгістраванай партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя **Паўла Пракаповіча**. На іх таксама былі складзеныя па два пратаколы па тым жа артыкуле за ўдзел у тых жа дзеяннях, у якіх удзельнічаў і Алесь Абрамовіч.

Нягледзячы на такі прэсінг з боку мясцовых праваахоўнікаў, актывісты КВП змаглі сабраць амаль сотню подпісаў пад калектыўным зваротам у Канстытуцыйны суд РБ. У ім дзеячы КВП заклікаюць, у прыватнасці, да прызнання неканстытуцыйнымі згаданых указаў прэзідэнта РБ, якія забараняюць у тым ліку і гандаль без сертыфікатаў ўвезенымі з іншых краін Еўразійскага эканамічнага саюза таварамі.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў разгрому "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY